# Пятрусь Броўка

(другі справа)



Пятрусь Броўка жыў у эпоху, калі ад народа замоўчваліся страшэнныя факты, калі чалавека спрабавалі (і даволі паспяхова) ператвараць у служку таталітарнай улады, шрубок, колца агульнапралетарскай справы.



Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла дзверы ў свет мастацтва таленавітаму сыну земляроба, сфарміравала яго аблічча, настроіла яго на ўдзячнасць, на высокую хвалю адкрытай публіцыстычнасці і непадробнага, заўзятага лірызму.



Так да канца сваіх дзён і заставаўся ён зачараваным мастаком і, пад канец дарогі, удумлівым філосафам, так і не расчараваўся ў ідэі магчымасці пабудовы самага справядлівага грамадства.



Нягледзячы на відавочныя катаклізмы, яскравыя выявы неадпаведнасці словаў – справе, лозунгаў і дэкларацый – рэаліям жыцця, Пятрусь Броўка спяваў свае песні пра гуманізм, справядлівасць, чалавечнасць, адказнасць мастака за ўсё на свеце.



ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ, ВЯРХОЎНАГА САВЕТА І САВЕТА МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

УСЕНАРОДНАЯ СПРАВА

ЛЕКЦЫІ, ГУТАРКІ

НАФТА ЗАХОДНЯЙ СІБІРЫ

Прапаганда Тэзісаў ЦК КПСС






І хоць Броўкі не было сярод спадарожнікаў М. Горкага на Беламорканал у час яго знакамітай вандроўкі, ёсць і яго частковая віна ў тым, што не ўбачылі ягоныя вочы ўсяго, што рабілася ў доме. Малады мастак уваходзіў у літаратуру з настроем апантанай радасці, узрушанасці, энтузіязму, настройваўся на хвалю дабразычлівасці і шчырасці.

Магчыма, адбывалася раздваенне пісьменніцкай асобы, здрада сабе самому, здрада тагачаснай жыццёвай праўдзе. Імітавалася праўда ўяўная, а не сапраўдная, за праўду выдаваўся камуфляж. І хоць мастацтва ўвогуле і не павінна адпавядаць рэчаіснасці, а павінна настройвацца на ўпадабненне ёй, на паказ яе як іншабыцця, на яе падвышэнне да пэўнага ўзору, ідэалу, падмена паняццяў, крытэрыяў прыгожага ў даваеннай літаратуры, як і ў творчасці П.Броўкі, відавочная.



Паэзія П.Броўкі засведчыла таксама вялікія магчымасці класічна суразмернага стылю, тое, што наватарства ў мастацтве з'яўляецца не толькі на глебе пагоні за знешнім эфектам, а на глебе неардынарнасці аўтарскага мыслення, вькарыстання не стэрыатыпных, а нечаканых сроднаў у разгоргванні лірычнага пачуцця.

